**Литература**

1. Дебидур, А. Дипломатическая история Европы / А. Дебидур. – Москва : Государственное издательство иностранной литературы, 1947 год. – 483 с.

2. История внешней политики России. Первая половина XIX века (От войн России против Наполеона до Парижского мира 1856 г.). – М. : Междунар. отношения, 1999. – 448 с.

# Эканамічны аспект знешняй палітыкі канфедэрацыі ў Еўропе

*Ермакоў Я. С., магістрант ГДУ,*
*навук. кір. Чаропка С. А., канд. гіст. навук, дац.*

Знешняя палітыка Канфедэрацыі (КША) мела на мэце здабыццё прызнання збоку вядучых краін свету, Вялікабрытаніі і Францыі. Няшмат рэсурсаў разам з пачаткам вайны прывялі канфедэратаў да актыўнай і разнапланавай знешнепалітычнай дзейнасці. Асобным аспектам выступае эканамічная палітыка КША. Такім чынам, мэта артыкула – разгледзіць асноўныя бакі эканамічнай знешнепалітычнай дзейнасці Канфедэрацыі ў Еўропе.

У англамоўнай гістарыяграфіі існуе думка, што ўся знешняя палітыка КША была звязана з бавоўнай. Паводле Ф. Оўслі, дыпламатыя «Караля бавоўны» «стала кардынальным прынцыпам тых людзей, якія вывялі Поўдзень з Саюза і якія кіравалі ім падчас грамадзянскай вайны» [1, p. 17].

Эканамічыя захады КША на міжнароднай арэне вызначаліся ўнутранымі праблемамі і толькі ў некаторай ступені былі звязаны са знешнімі. Згодна Дж. Дэвісу, «урад пачаў сваё існаванне не толькі без ваеннага ўзбраення, але і без казны» [2, p. 121]. Захады былі звязаны з дзейнасцю трэцяга дзяржаўнага сакратара Дж. Бенджаміна, міністра фінансаў К. Мемінгера і некаторых пасланнікаў Канфедэрацыі. Галоўнай мэтай было знаходжанне дадатковых фінансавых сродкаў і, пры магчымасці, арганізацыя паўнавартаснай эканамічнай падтрымкі.

Канфедэратамі былі прапанаваны спробы наладзіць пастаўку бавоўны абыходзячы балакаду паўднёвых партоў [3, p. 116]. Аднак гэтыя захады былі спачатку непапулярны, бо прэзідэнт Канфедэрацыі Дж. Дэвіс баяўся прадаваць бавоўну з-за магчымага ўзмацнення блакады. У сваю чаргу ён лічыў, што бавоўна, якая будзе хавацца на плантацыях, з’яўляецца найлепшай асновай валюты і ўсёй канфедэратыўнай еўрапейскай дыпламатыі [4, p. 61; 5, p. 88]. Апроч меркавалася, што змяненне паставак бавоўны ў бок змяшэння прымусіць знізіць узровень «нейтральнай палітыкі» еўрапейскіх краін [6, p. 198].

Бавоўну можна разглядаць і не толькі як сродак правядзення знешняй палітыкі КША. Тут існуюць пэўныя поспехі, звязаныя з т.зв. «баваўнянымі аблігацыямі». Так, зімой 1862–1863 гг. прайшлі перамовы паміж урадам і французскім банкірам Э. Эрлангерам аб крэдыце [4, p. 65; 5, p. 54]. У студзені 1863 г. быў заключаны канчатковы дагавор, згодна з якім Э. Эрлангер быў абавязаны зрабіць даступным для Канфедэрацыі крэдыт тэрмінам на 20 гадоў на суму 3 млн фунтаў (або 15 млн даляраў КША) шляхам продажу на еўрапейскім рынку канфедэратыўных аблігацый. Гэтыя аблігацыі мусілі даць 7%-ю стаўку і падлягалі пагашэнню ў якасці сертыфікатаў на бавоўну [5, p. 61; 7, p. 400].

З сакавіка 1863 г. аблігацыі Канфедэрацыі пачалі з'яўляцца на ўсіх буйных фінансавых рынках Еўропы. Да сярэдзіны ліпеня яны мелі попыт, і канфедэратыўны крэдыт быў фактычна пагашаны ў пяць разоў [4, p. 66]. Гэтая папулярнасць была абумоўлена пэўнай таннасцю і забяспечанасцю іх бавоўнай [8, p. 33]. Аднак перамогі ЗША пад Гецісбергам і Віксбергам у ліпені 1863 г. і перакрыццё воднага шляху па р. Місісіпі зрабілі аблігацыі непапулярнымі. Але сродкі, якія былі ўзяты такім чынам, адтэрміналі паражэнне КША, бо з іх дапамогай яны набывалі небходныя рэчы для вядзення вайны [8, p. 43; 4, p. 66].

У гістарыяграфіі маюцца розныя думкі наконт эфектыўнасці і зместу гэтай палітыкі. Так, напрыклад, Г. Джонэс піша, што «стратэгія караля бавоўны падвяла дыпламатаў КША... Яна ніколі не выклікала дастаткова... інтарэсу з боку Брытаніі і Францыі... каб яны ўмяшаліся ў вайну» [9, p. 47]. Ф. Оўслі ў сваю чаргу акцэнтуе ўвагу, што адзначаныя дзяржавы змаглі эфектыўна прыстасавацца да склаўшыхся абставін з паўстаўкамі бавоўны, таму не былі ў неабходнай ступені зацікаўлены ў дзейнай падтрымцы Канфедэрацыі [1, p. 563]. З гэтым можна пагадзіцца, дадаўшы, што немагчымасць паставак бавоўны, у тым ліку дзякуючы дзеянням ЗША, стала адной з прычын паразы КША. Дыпламатыя «Караля бавоўны» не змагла даць іншыя альтэрнатывы, калі з'явіліся пэўныя знешнія і ўнутраныя перашкоды.

## Літаратура


1. Owsley, F. L. King Cotton Diplomacy. Foreign Relations of the Confederate States of America / F. L. Owsley. – 2-nd edition. – Chicago : University of Chicago Press, 1959. – 614 p.
2. Davis, J. A short history of confederate states of America / J. Davis. – New York, Belford co., 1890. – 552 p.
3. Evans, E. Judah P. Benjamin: The Jewish Confederate / E. Evans. – Free Press, 1989. – 512 p.
4. Peterson, D. L. Confederate Cabinet Departments and Secretaries / D. L. Peterson. – McFarland&Company, 2016. – 296 p.
5. Callahan, J. M. The diplomatic history Southern Confederacy / J. M. Callahan. – Baltimore : The Johns Hopkins Press, 1901. – 304 p.

6. James, M. Mason to J. P. Benjamin, March 11, 1862 // A compilation of the messages and papers of the confederacy including diplomatic correspondence 1861–1865: in 2 vol. / ed. by James D. Richardson. – Nashville : United States Publishing Co., 1950. – Vol. 2. – P. 197–201.
7. J. P. Benjamin to J. M. Mason, January 15, 1863 // A compilation of the messages and papers of the confederacy including diplomatic correspondence 1861–1865: in 2 vol. / ed. by James D. Richardson. – Nashville : United States Publishing Co., 1950. – Vol. 2. – P. 398–401.
8. Christopher, J. The Confederate States of America, 1861–1865 : a financial and industrial history of the South during the Civil War / J. Christopher. – New York : Charles Scribner's Sons, 1901. – 332 p.
9. Jones, H. Blue and Gray Diplomacy: A History of Union and Confederate Foreign Relations / H. Jones. – University of North Carolina Press, 2010. – 432 p.

# К вопросу о правовой квалификации распространения недостоверных сведений в сети Интернет в ходе избирательных кампаний

*Жалдыбин А. В., асп. БГУ,*
*науч. рук. Дейкало Е. А., канд. юр. наук, доц.*

Еще до недавнего времени в качестве наиболее вероятных форм вмешательства в дела государства (например, для смены политического режима) заинтересованными правительствами рассматривались всесторонняя поддержка оппозиции (финансовая, организационная и др.), дипломатическое давление, реже – вооруженная интервенция.

Однако развитие информационных технологий позволило существенно расширить арсенал инструментов такого вмешательства, характеризующихся высокой степенью технической сложности и анонимности. Актуальность данная проблема получила в ходе проведения избирательной кампании Президента США в 2016 г. Указанный пример привлек внимание международного экспертного сообщества по ряду причин. Во-первых, встал вопрос о возможной новой сфере применения кибератак; во-вторых, в очередной раз в международно-правовую повестку дня вошли вопросы квалификации кибератаки, присвоения поведения частных субъектов государству, определения адекватных ответных действий и др.

Интересным вопросом в контексте рассматриваемой проблематики является возможная квалификация распространения недостоверной («фейковой») информации в сети Интернет в целях достижения наиболее благоприятного исхода политической кампании (американские эксперты, чиновники и журналисты обвиняли Россию, действовавшую через подвластные ей структуры, во вмешательстве во внутренние дела США).